# РАЗДЕЛ 1. МЕЖДУНАРОДНЫЕ ОТНОШЕНИЯ. ГОСУДАРСТВО И ПРАВО. ПОЛИТОЛОГИЯ. ИСТОРИЯ

## Фактар нацыянальных меншасцей і грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1937–1939 гг.

*Альховік М. К., асп. БДУ,*
*навук. кір. праф. Альховік І. І., д-р гіст. навук*

У сярэдзіне 1937 г. партыйна-савецкае кіраўніцтва СССР перайшло да фарсаванай асіміляцыі нацыянальных меншасцей. Кіраўніцтву БССР даручалася падрыхтаваць грамадскую думку да новай этнакультурнай сітуацыі. У ліпені – жніўні 1937 г. у цэнтры палітычнай прапаганды апынулася спачатку пытанне ліквідацыі наступстваў дзейнасці «польскіх шпіёнаў і дыверсантаў», а таксама рэарганізацыі польскіх школ, калгасаў і сельсаветаў, якія падаваліся як «асяродкі антысавецкай барацьбы». У перыядычных выданнях друкаваліся звароты грамадскасці польскага Дзяржынскага раёна ў падтрымку яго ліквідацыі. Так, сяляне калгаса «Трыбуна Радзецка» (Негарэльскі сельсавет Дзяржынскага раёна) прасілі Менскі РВК перайменаваць калгас «Трыбуна Радзецка» ў калгас імя тав. Якаўлева, бо «назва нашага калгаса... навязана польскімі шпіёнамі і дыверсантамі» [1, с. 3]. 14 верасня 1937 г. у газеце «Звязда» быў надрукаваны артыкул Р. Фралова «Хто ўзначальвае Дзяржаўную бібліятэку». Аўтар артыкула фактычна заклікаў ліквідаваць яе беларускі, польскі і яўрэйскі аддзелы. Неабходнасць рэарганізацыі яўрэйскага аддзела абгрунтоўвалася засмечанасцю «буржуазна-нацыяналістычнай», «трацкісцка-бундаўскай» і рэлігійнай літаратурай і антысавецкімі кадрамі. Адзначалася таксама, што «польскі аддзел быў арганізаваны... з пэўнай контррэвалюцыйнай паланізатарскай мэтай. У ім таксама канцэнтраваліся і беражліва ахоўваліся «працы» польскіх буржуазных нацыяналістаў, верных служак польскай замежнай разведкі» [2, с. 3]. Нацыянальныя аддзелы бібліятэкі былі ліквідаваны ў канцы 1937 г.

Адно з важных месцаў у нацыянальнай палітыцы да сярэдзіны 1938 г. займала прапаганда Яўрэйскай аўтаномнай вобласці як формы савецкай дзяржаўнасці яўрэйскага народа і дзейнасць арганізацый АЗЭТ па перасяленні працоўных яўрэяў у Бірабіджан і Крым. Да сярэдзіны 1938 г. партыйна-дзяржаўныя органы дэманстравалі сваё імкненне да барацьбы з антысемітызмам, а таксама забяспечвалі адукацыю яўрэйскага насельніцтва на яго роднай мове.

У ліпені 1938 г. дэлегаты 1 сесіі Вярхоўнага савета БССР прагаласавалі за ўнясенне зменаў у 25 і 119 артыкулы Канстытуцыі БССР. Выключэнне польскай мовы і мовы ідыш са спісу дзяржаўных моў БССР аргументавалася тым, што «яшчэ ніколі так моцна не была цяга працоўных усіх нацыянальнасцей да рускай мовы», а таксама тым, што «выбаршчыкі ў шматлікіх хадайніцтвах перад урадам БССР просяць рэарганізаваць цэлы рад нацсаветаў у беларускія». Праўда, адзін з выступоўцаў адзначыў, што «гэтыя змены не азначаюць ушчамлення правоў асобных нацыянальных меншасцей на тэрыторыі БССР», але не стаў далей развіваць тэму. Парадак работы сесіі і тэксты выступленняў дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР распрацоўваліся пад кіраўніцтвам бюро ЦК КП(б)Б [3, арк. 68]. Савецкая прапаганда не прызнавала факту забароны моў нацыянальных меншасцей БССР. Так, падчас перапісу насельніцтва ў 1939 г. у перыёдыцы рэспублікі ўказвалася, што «толькі ў нашай краіне сацыялізму разам з рускай мовай з поспехам развіваюцца мовы ўсіх нацыянальнасцей» [4, с. 3].

Нацыянальная палітыка ў адносінах да яўрэйскага, украінскага, цыганскага і асірыйскага насельніцтва адрознівалася ў лепшы бок. Прадстаўнікі гэтых нацыянальнасцей не мелі за мяжой Савецкага Саюза буржуазных нацыянальных утварэнняў, а значыць, не мелі магчымасці ажыццяўляць «шкодніцтва і шпіянаж» на карысць сваёй гістарычнай радзімы. У 1937 г. фальклорная камісія АН БССР узнавіла работу па зборы яўрэйскага фальклору на фабрыках, у прамысловых арцелях, калгасах Бабруйскага, Магілёўскага, Чашніцкага, Нараўлянскага і іншых раёнаў і мястэчак БССР. У сярэдзіне 1937 г. у Магілёве адбыліся гастролі ўкраінскага дзяржаўнага тэатра горада Сталіна. У сакавіку 1938 г. студэнты Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута зладзілі да дня Парыжскай камуны інтэрнацыянальны вечар, падчас якога ўжываліся французская, іспанская, нямецкая, руская, украінская, беларуская мовы, а таксама мова ідыш [5, с.4]. На Менскай абласной алімпіядзе мастацкай самадзейнасці 23 кастрычніка 1938 г. выконваліся песні і вершы на беларускай, рускай мовах і мове ідыш [6, с.4]. Да пачатку 1939 г. сотні цыганскіх сем'яў працавалі на прадпрыемствах і ў калгасах. У адным толькі Уваравіцкім раёне летам 1938 г. у калгасы ўступіла 80 цыганскіх сем'яў [7, с. 3]. У 1937 г. у перыядычным друку БССР згадвалася і аб існаванні асірыйскага насельніцтва.

## Літаратура


1. Калгаснікі Дзяржынска клеймяць прэзрэннем шпіёнаў-паланізатараў, якія здзекваліся над беларускім народам // Звязда. — 1937. — 11 жн. — С. 3.
2. Фралоў, Р. Хто ўзначальвае Дзяржаўную бібліятэку // Звязда. — 1937. — 14 вер. — С. 3.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. — Фонд 4 п. — Вопіс 1. — Справа 12832.

4. Дняпроўскі, С. Узорна падрыхтуемся да ўсесаюзнага перапісу насельніцтва. — Звязда. — 1939. — 8 студз. — С. 3.
5. Інтэрнацыянальны вечар // Чырвоная змена. — 1938. — 17 сак. — С. 4.
6. Матузаў, З. Менская абласная алімпіяда мастацкай самадзейнасці // Чырвоная змена. — 1938. — 24 кастр. — С. 4.
7. Пасяджэнне Савета Народных камісараў // Звязда. — 1939. — 20 студз. — С. 3.

## Внешнеполитическая деятельность администрации Б. Обамы

*Барахвостов П. А., студ. IV к. БГУ,*
*науч. рук. Русакович А. В., канд. ист. наук, доц.*

Несмотря на экономическое и военное превосходство США, в первое десятилетие XXI века не удалось достичь желаемых результатов при реализации доктрины Дж. Буша: США не сумели овладеть всеми контрольными рычагами мирового развития. К концу 2000-х стала очевидной неосуществимость надежд Вашингтона на создание жесткого монополярного мира. В 2010 г. президентом США Б. Обамой была обнародована новая стратегия национальной безопасности [1], призванная восстановить престиж США. Положения документа 2010 г. тесно связаны с доктринами Б. Клинтона и Дж. Буша в главном: цель деятельности администрации США — реализация стратегии глобального лидерства, обеспечение наиболее благоприятных, безопасных условий для Америки. В этом смысле имеет место преемственность в стратегии внешней политики.

Однако, в отличие от доктрины Дж. Буша, для достижения глобального лидерства США планируется основной упор делать на «мягкую силу»: дипломатию, сотрудничество и международно-правовое урегулирование. В новой стратегии нет упоминаний об одностороннем превентивном ударе, который проводится без весомых доказательств об угрозе и соответствующих решений международных организаций. Кроме того, отсутствует «исламский экстремизм» в качестве источника угрозы. Подчеркивается, что США будут осуществлять отношения позитивного партнерства с мусульманскими общинами по всему миру. Признается тот факт, что в современных условиях угрозы государству могут проистекать не только и не столько со стороны государств и созданных ими организаций, сколько иметь «сетевой» характер и включать самых разнообразных по своей природе акторов.

Важнейшим моментом внешнеполитической стратегии Б. Обамы является подтверждение тенденции мирового развития к формированию нескольких центров силы. Американское лидерство, по словам Б. Обамы, будет